Галоўнае упраўленне па адукацыі Мінскага аблвыканкама
Упраўленне па адукацыі Мінскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Мачулішчанская сярэдняя школа імя Герояў Савецкага Саюза
Удавенка І.Ц. і Гаманенка М.В.»

Рэспубліканскі конкурс
«Лепшая метадычная распрацоўка музейнага занятку»
Намінацыя «Музейная гульня»

# Этнаграфічны батл

# «Калі ласка, госці, у хату…»

(пазнавальна-забаўляльная гульня)

Аўтары: Янцэвіч Кацярына Сяргееўна, вучаніца 11 класа;
Вароніна Анастасія Андрэеўна, вучаніца 11 класа;
Каралёнак Жанна Леанідаўна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры, кіраўнік школьнага музея «Спадчына;
Мілюкова Наталля Алегаўна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры

Мінскі раён
2021

# Уводзіны

Сёння ў нашай хаце свята,
Калі ласка, у нашу хату,
Гэй, рады спаткаць,
Гуляць дык гуляць.

*У. Някляеў*

**Актуальнасць.** Тэрмін «музейная педагогіка» ў апошні час стаў вельмі папулярным. Усё часцей прастору музея выкарыстоўваюць для грамадзянскага і патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Музей і яго экспанаты становяцца партнёрам настаўніка па рашэнню задач, звязаных з выхаваннем вучняў, а музейныя ўрокі садзейнічаюць павышэнню якасці адукацыі.

Этнаграфічны батл – гэта нетрадыцыйны музейны занятак, які пры дапамозе сапраўдных экспанатаў музея дазваляе стварыць атмасферу мінулага ў сучасным асяроддзі і пагрузіцца ў яе; развівае этнаграфічную культуру вучняў; выхоўвае цікавасць да народных традыцый, абрадаў, звычаяў; садзейнічае яднанню вучняў і настаўнікаў, бо ўсе ўдзельнікі атрымліваюць творчы імпульс да развіцця сваіх творчых здольнасцей; актывізуе пазнавальную дзейнасць вучняў.

Этнаграфічны батл – гэта інавацыйная педагагічная тэхналогія. У гэтым яе актуальнасць і значнасць.

**Мэта:** праз гульню паглыбіць веды ўдзельнікаў гульні па беларускім фальклоры, этнаграфіі, народным мастацтве, літаратуры, музыцы.

**Задачы:**

развіваць этнаграфічную культуру ўдзельнікаў гульні;

выхоўваць цікавасць да народных традыцый, абрадаў, звычаяў;

абуджаць патрэбу глыбей спазнаваць гісторыю і культуру свайго народа;

згуртаваць вучняў і настаўнікаў у адзіны калектыў аднадумцаў.

**Месца правядзення:** школьны музей «Спадчына».

**Форма занятка:** этнаграфічны батл – музейна-педагагічны занятак у форме пазнавальна-забаўляльнай гульні.

**Удзельнікі**: вучні старэйшых класаў і настаўнікі.

## Асноўная частка

**Апісанне гульні.** Этнаграфічны батл «Калі ласка, госці, у хату... » – гэта пазнавальна-забаўляльная гульня, у якой удзельнікі некалькіх каманд (мінімум дзвюх) вучняў старэйшых класаў і настаўнікаў дэманструюць веданне беларускіх народных традыцый, творчыя здольнасці, спрыт, гумар, імправізіруюць на заданыя тэмы.

**Умовы гульні.** У батле ўдзельнічае некалькі каманд (дзве і больш). Кожная каманда прымае ўдзел у конкурсах. Пасля кожнага конкурса называецца пераможца. У канцы гульні журы аб'яўляе пераможцу па большай колькасці набраных балаў.

**Конкурсы.**

*Першы конкурс* – «Візітоўка». Кожная каманда за тры хвіліны павінна расказаць пра сябе.

*Другі конкурс* – «Запрашэнне». За пяць хвілін камандам неабходна стварыць запрашальную паштоўку.

*Трэці конкурс* – «Вада-вадзіца з чыстае крыніцы». У конкурсе удзельнічае адзін чалавек ад каманды. Па свістку ўдзельнікі бяруць карамысла, 2 вядры і бягуць за вадой. Перамагае той, хто хутчэй і болей прынясе вады.

*Чацвёрты конкурс* – «Хлеб-соль». Каманды загадзя атрымліваюць заданне спячы торт, пірог, булачкі (на выбар) і цікава прадставіць свой выраб.

*Пяты конкурс* – «Святочнае меню». Кожнай камандзе за 5 хвілін неабходна выбраць з наяўных картак назвы беларускіх страў і скласці святочнае меню.

*На картках — назвы беларускіх народных страў і словы-"самазванцы".*

*Жур, пячыста, мачанка, конаўка, верашчака, хрусты, пячурка, мянташка, локшыны, ламанцы, мачыльня, наліснікі, лядоўня, панцак, калдуны, жырандоль, капытка, жвір, узвар, збінец, палукашак.*

*Шосты конкурс* – «Спрытная гаспадыня». Гэта сапраўдная вясёлая эстафета. Ад кожнай каманды ўдзельнічаюць 5 чалавек. Па свістку адзін удзельнік бяжыць да печы, бярэ чыгунок, кідае ў яго тры морквіны і вяртаецца з ім да каманды, перадае яго натупнаму ўдзельніку, той нясе чыгунок да печы, ставіць на прыпечак, далей бярэ драўлянай лыжкай яйко з рэшата і вяртаецца з ім да каманды, перадае наступнаму удзельніку, трэці удзельнік нясе яйко назад, кладзе яго ў рэшата, бярэ кош і збірае ў яго рассыпаную бульбу, нясе кош наступнаму удзельніку, чацвёрты нясе кош на месца, бярэ маслабойку і нясе яе пятаму удзельніку, пяты адносіць маслабойку на месца, бярэ рушнік, скручвае яго на качалку і качае рушнік рубелем (5 рухаў), вяртаецца да каманды. Перамагае той, хто першы выканае заданні.

*Сёмы конкурс* – «Чароўны куфэрак». За 10 хвілін удзельнікам конкурса трэба знайсці ў куфры святочнае адзенне і апрануць аднаго члена каманды. А пасля ў гэтым строі прадэфіліраваць перад журы.

*Восьмы конкурс* – «Забаўкі для гасцей». Кожная каманда дэманструе гульню, танец, жарт ці што іншае, чым можна гасцей забавіць.

Пасля журы падводзіць вынікі батла, называе пераможцу і ўручае прызы.

**Абсталяванне**: музейная прастора, экспанаты з фондаў музея (каромысла, чыгункі, рубель, качалкі, кошык, нацыянальныя строі, паштоўкі, алоўкі, фарбы, карткі, музыка).

**Сістэма ацэньвання.** Журы – склад 5 чалавек.

## Сцэнарый батла

*Гучыць музыка (трэк Witany, гурт «Стары Ольса»)*
*На фоне музыкі выходзяць вядучыя – бабуля ў беларускім нацыянальным строі і ўнук у маладзёжным адзенні*

*Бабуля:* Дзень добры, паважаныя сябры! Шчыра вітаем Вас у нашай музейнай прасторы!
*Унук:* Прывецікі!
*Бабуля:*

Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы,
Надзейныя сябры і дружбакі.
І, госць, і падарожны ў нас як дома.
А злым і травы колюцца ў бакі.
Гатовы ўсё аддаць –
І тым багаты,
Мы, беларусы,
Мы – народ такі.

*Унук:* Ты, бабулечка, як заўжды, з вершамі ды прымаўкамі. Па праўдзе кажучы, гэтыя радкі Рыгора Барадуліна дакладна падыходзяць да той дзеі, якая праз некалькі хвілін адбудзецца ў нашым музеі.
*Бабуля:* Цікава. А што ж такога тут адбудзецца?
*Унук:* Батл.
*Бабуля (здзіўлена, прыкладаючы руку да сэрца):* А Божачкі! Які такі батл?
*Унук (спакойна):* Этнаграфічны.
*Бабуля:* Ты не блытаеш? Мы ж хацелі, каб нашы ўдзельнікі паспаборнічалі, паказалі на што здатныя, веды свае прадэманстравалі. А тут батл нейкі.
*Унук:* Бабуля, батл – гэта і ёсць спаборніцтва. Разумееш? Гэта тое ж самае. Толькі слова іншае. Сучаснае. Моднае… Мы ж у Прысталіччы жывем, разумееш…
*Бабуля (лагодна):* Во яно як. Які ўнучак у мяне файны. Сучасны. Модны. Хоча, каб і бабуля ад моды на словы не адстала. Ну, батл дык батл. Няхай будзе модна, стыльна, маладзёжна, але крыху і па-даўнейшаму. Let's Go! Show, міленькі.

*Унук:* І так. Мы пачынаем этнаграфічны батл. Сёння яго ўдзельнікі раскажуць і пакажуць, як на Беларусі сустракаюць гасцей. Каму, як не нам, такому гасціннаму народу, гэта паказаць. У батле прымаюць удзел дзве каманды – каманда настаўнікаў (*яе назва*) і каманда вучняў (*яе назва*). Вітаем каманды. Яны вясёлыя, знаходлівыя, актыўныя і гатовыя да любых нечаканасцяў.

*Бабуля:* Ну і якое спаборніцтва без журы?За батлам сочаць і ацэньваюць удзельнікаў… *(называюцца члены журы, іх 5 чалавек)*

*Гучыць музыка («Касіў Ясь канюшыну», «Песняры»)*

*Унук:* А наш першы конкурс называецца «Візітоўка». Кожная каманда за тры хвіліны павінна расказаць пра сябе.

*Каманды па чарзе выступаюць*
*Журы агучвае вынікі першага конкурсу.*

*Бабуля:*

Нашы дзверы ўсім адкрыты,
Просім гасцей ў хату!
І накормім, і напоім
Усім, чым багаты!

*Унук:* А наступны конкурс, як вы зразумелі, называецца «Запрашэнне». Камандам за пяць хвілін неабходна стварыць запрашальную паштоўку. Можна маляваць, выразаць, выдумляць, а пасля абараніць сваю работу.

*Каманды працуюць пад беларускую народную песню «Прывітальная».*
*Каманды па чарзе выступаюць*
*Журы агучвае вынікі другога конкурсу.*

*Унук:* Як табе, бабуля, візітоўкі нашых каманд?
*Бабуля (бадзёра):* Крэатыўна.
*Унук (смеючыся):* Так-так. Рухаемся далей.
*Бабуля:* Гасцей запрасілі, трэба хату прыбіраць, а вады ні кропелькі няма. Няхай каманды сходзяць па ваду аж вунь у той калодзеж *(рукой паказвае некуды).*
*Унук:* Далёка.
*Бабуля:* Нічога. Няхай пакажуць і сілу і спрыт. Бярыце, даражэнькія, па каромыслу, вёдры і хуценька нясіце ваду.

*Пачынаецца трэці конкурс «Вада-вадзіца з чыстае крыніцы».*
*Падчас конкурсу гучыць песня «Цячэ вада ў ярок».*
*Журы абвяшчае пераможцу.*

*Унук:* Во гэта хуткасць. Во спрыт. Малайцы! А цяпер, мяркую, можна і за пачастункі брацца. З чаго пачнём?
*Бабуля:* А чым на Беларусі гасцей сустракаюць?
*Унук:* Хлебам-соллю.
*Бабуля (чытае верш Сцяпана Гаўрусёва «Хлеб-соль»):*

На ручніках, расшытых пеўнямі,
хлеб-соль падносім да гасцей,

вядзем за стол, каўшамі пеннымі
частуем брагай пагусцей.
І не хаваем - дзе падзенешся? –
сваіх пачэсных мазалёў.
А трэба — крошкаю падзелішся:
лепш сто сяброў, чым сто рублёў.

*Унук:* Наш наступны конкурс так і называецца «Хлеб-соль». Давайце паслухаем, што раскажуць каманды пра свае вырабы і, канешна, пакаштуем.

*Каманды прадстаўляюць загадзя падрыхтаваныя да конкурсу пірагі, булкі або хлеб і абараняюць свой выраб. Пачынае каманда з меньшай сумай балаў. Журы агучвае вынікі чацвёртага конкурсу.*

*Унук (задаволена):* Во смаката!
*Бабуля (бадзёра):* Крэатыўна.
*Унук (смеючыся):* Так-так. Але каб яшчэ чаго смачненькага…
*Бабуля:* Галоднай курцы зярнятка на думцы. А то як жа. Нешта трэба і да хлеба. Наступны конкурс называецца «Святочнае меню». Кожнай камандзе за 5 хвілін неабходна выбраць з наяўных картак назвы беларускіх страў і скласці святочнае меню, каб усе густы гасцей задаволіць.

*Каманды рыхтуюць святочнае меню пад песню «Бульба» А. Жыгалковіча, пасля прадстаўляюць свае работы, журы ацэньвае і называе пераможцаў пятага конкурсу.*

*Бабуля (звяртаецца да ўнука):* Ці смачненька будзе, як думаеш?
*Унук:* Во! *(паказваее вялікі палец).* Каб гэтак нас у школьнай сталоўцы кармілі, то былі б мы .. во *(надзьмувае шчокі),* здаровыя значыць.
*Бабуля:* Так, беларускія стравы каманды добра ведаюць. Але ў народзе кажуць: якая гаспадыня, такі і парадак.
*Унук:* А-а… Гэта бабуля мае на ўвазе, што наступны конкурс трэба аб'яўляць. Ён называецца «Спрытная гаспадыня». Гэта сапраўдная вясёлая эстафета. Ой, і цікава будзе….

*Конкурс праходзіць пад музыку "Лявоніха".*
*Журы называе пераможцу.*

*Унук:* А наперадзе яшчэ адзін конкурс. Ён называецца «Чароўны куфэрак».
*Бабуля (чытае верш М. Багдановіча):*

У Максіма на кашулі вышыты галубкі;
Я за тое вышывала, што цалуе губкі.
У Максіма на кашулі вышыты лісточкі;
Я за тое вышывала, што цалуе вочкі.
У Максіма на кашулі вышыты падкоўкі;
Я за тое вышывала, што цалуе броўкі.

І ў нашым куфры столькі прыгожых строяў, што ні адна модніца не адмовіцца.
*Унук:* Так. Удзельнікам наступнага конкурсу трэба апрануцца па-святочнаму – госці ж хутка на парозе будуць.
*Бабуля:* А то як жа, даражэнькі…

*Конкурс адбываецца пад беларускую народную песню*
*«А ў Марусі хата на памосце», ансамбль «Бяседа».*
*Журы абвяшчае пераможцу.*
*Перамагае той, хто першы выканае заданні.*

*Унук:* Ну як табе, бабуля, наша дэфіле ў нацыянальных строях?
*Бабуля:* Ото ж хораша! Прыгожа! Заўтра і я па Мачулішчах буду дэфіліраваць у новай спадніцы і бліскучых чаравіках.
*Унук:* Сцеражыцеся, людзі, што і будзе… Забава ды і толькі.
*Бабуля:* А якія ж госці без забаў? Беларусы гавораць: «Калі не спявалі, то і не весяліліся».
*Унук:* Так. Надышоў час апошняга конкурса «Забаўкі для гасцей». Кожная каманда дэманструе гульню, танец, жарт ці што іншае, чым можна гасцей забавіць.
*Журы абвяшчае пераможцу гэтага конкурса.*

*Унук*: Вось і скончыўся наш батл.
*Бабуля:* Шаноўнае журы падводзіць яго вынікі. І хутка мы даведаемся, што мы тут набатлілі. А пакуль давайце адзін аднаму паапладзіруем, бо ўсе удзельнікі вялікія малайцы.

*Слова журы.*
*Абвяшчэнне вынікаў гульні.*
*Пераможца атрымлівае сувенір, другая каманда – суцяшальны прыз (цукеркі).*

*Унук:* Шаноўныя сябры, да новых сустрэч. Бывайце здаровы, жывіце багата! Няхай шчасце будзе ў кожнай хаце. Няхай шчасце будзе не выпадкам, а частым госцем кожнага чалавека. Давайце жыць у міры і згодзе пад шчаслівым дахам нашай Беларусі.

*Бабуля:* Каб вам смачна спалася і лёгка ўставалася. Каб сталы ў вашых хатах былі багатымі, а душы і сэрцы - шчодрымі. Часцей азірайцеся, сябры, назад, у мінулае, каб не пагасла свечка на покуці - у хаце з матчынай душою.

*Зноў гучыць беларуская народная музыка.*
*Удзельнікі батла танцуюць, спяваюць.*

## Заключэнне

Педагагічная задача настаўніка заключаецца ў тым, каб дапамагчы кожнаму вучню ўсвядоміць сваю ўнікальнасць і стварыць умовы для яго самаразвіцця.

Музейныя ўрокі-гульні рэалізуюць адну з патрэб чалавека – пазнавальную, садзейнічаюць развіццю і праяўленню творчага патэнцыялу, уздымаюць на якасна новы ўзровень веды, уменні і навыкі вучняў.

Музейныя ўрокі-гульні – пошук новых падыходаў у выхаванні падрастаючага пакалення сродкамі музейнай педагогікі; пошук новых ведаў і ўменне прымяняць ужо вядомае; актыўная дзейнасць як педагога, так і навучэнца. Сапраўдны педагог не той, хто вучыць, а той, у каго вучні вучацца.

Распрацоўку этнаграфічнага батла «Калі ласка, госці, у хату… » магчыма укараніць ў адукацыйны працэс.

*Дадатак*

**Фотаздымкі**

| | |
|---|---|
|  |  |
|  |  |
|  |  |

| | |
|---|---|
|  |  |
|  |  |